РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
24 КРАСАВІКА 2025 г. ЧАЦВЕР № 80 (30468)



Фота з архіва БелТА.

# СВЯТЛО ЧАЛАВЕЧАГА ШЧАСЦЯ

Сям'я — індыкатар грамадства. Людзі ахвотна бяруць шлюб і нараджаюць дзяцей там, дзе шануюцца традыцыі, захоўваецца мараль, ёсць упэўненасць у заўтрашнім дні. У сучаснай Беларусі падтрымка сям'і — нацыянальны прыярытэт. Для сем'яў з дзецьмі створана цэлая сістэма дзяржаўнай дапамогі. І маладыя людзі сёння не баяцца афармляць свае адносіны, яны паспяхова сумяшчаюць сямейныя абавязкі з вучобай, мацярынства і бацькоўства — з рэалізацыяй самых смелых планаў.
Мы пазнаёміліся з некалькімі маладымі парамі, каб распытаць, як у іх гэта атрымліваецца.

СТАР. 4

# «НАПАМІН АБ НАШАЙ РАШУЧАСЦІ»

**У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі ВАВ прайшла Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 80-годдзю Вялікай Перамогі**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

У канферэнцыі ўзялі ўдзел дэпутаты, прадстаўнікі Міністэрства культуры, Міністэрства замежных спраў, вучоныя-гісторыкі, кіраўнікі гістарычных музеяў, міжнародныя грамадскія дзеячы з Беларусі, Расіі, а таксама краін далёкага і блізкага замежжа.

**Міністр замежных спраў Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ** адзначыў: «Канферэнцыя — важная інфармацыйная нагода для працягу работы па захаванні памяці аб самай маштабнай і разбуральнай вайне ў гісторыі чалавецтва. Гэта напамін аб нашай рашучасці не дапусціць паўтарэння падобных жахаў у будучыні. 80 гадоў таму краіны-ўдзельніцы стварылі Арганізацыю Аб'яднаных Нацый. З асаблівым гонарам адзначу, што сярод гэтых дзяржаў была і Беларусь.

СТАР. 3

З НАГОДЫ

# ЛЯГЧЭЙ ПАПЯРЭДЗІЦЬ

**Спецыялісты расказалі, якія прышчэпкі патрэбныя ўсім**



З 27 красавіка стартуе Еўрапейскі тыдзень імунізацыі. У Беларусі ахоп прафілактычнымі прышчэпкамі складае каля 97-98 %. Адным з прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі з'яўляецца якраз прыярытэтнасць мер прафілактычнай накіраванасці. Дзякуючы прышчэпкам у нашай краіне шмат гадоў не рэгіструюцца выпадкі такіх небяспечных хвароб, як, напрыклад, поліяміэліт, дыфтэрыя, слупняк.

СТАР. 8

# БІБЛІЯТЭКІ З НЯЗВЫКЛАЙ АТМАСФЕРАЙ

**Чым будзе адметная «Бібліяноч-2025»?**

25 красавіка бібліятэкі Беларусі адчыняць свае дзверы для наведвальнікаў культурна-асветніцкай акцыі «Бібліяноч-2025». Сёлета ўдзел у ёй плануюць узяць 81 горад і 96 бібліятэк. Пра тое, што падрыхтавалі культурныя ўстановы, расказалі напярэдадні іх прадстаўнікі на сустрэчы з журналістамі.

Наведаць упадабаныя лакацыі можна з 19.00 да 23.00. Кожная бібліятэка-ўдзельніца падрыхтавала для сваіх гасцей творчыя сустрэчы, майстар-класы, лекцыі, тэматычныя пляцоўкі, экскурсіі.

— У гэты вечар бібліятэкі пашыраць фармат сваёй работы і прадставяць наведвальнікам нязвыклыя культурныя праграмы. Асноўная тэма «Бібліяночы-2025», вядома ж, — 80-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Шмат мерапрыемстваў прысвечаны гэтай святочнай даце. Адзначу, што акцыя мае сацыяльны характар і ўваход на ўсе мерапрыемствы свабодны, — расказала **загадчык сектара сацыяльна-культурных праектаў аддзела сувязяў з грамадскасцю Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Юлія ВАЛУЕВА.**



У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі «Бібліяноч-2025» пройдзе па тэме «Перамога. Памяць. Мір», што дазволіць аўдыторыі паглыбіцца ў гісторыю ваенных гадоў і адчуць атмасферу гераічнага мінулага. Такую магчымасць, напрыклад, дасць прэзентацыя серыі праектаў ад Беларускага саюза журналістаў да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне або патрыятычная акцыя «Пераможнаму маю прысвячаецца», арганізаваная разам з Нацыянальнай школай прыгажосці. Яшчэ чытачоў чакаюць патрыятычная гульня і шэраг тэматычных квэстаў, паказ ваеннай кінастужкі «Час вярнуцца» з удзелам рэжысёра і г. д.

У сталіцы наведвальнікаў будуць чакаць і ў іншых месцах. Напрыклад, адкрыць для сябе свет навукі можна ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Цэнтральная дзіцячая бібліятэка падрыхтавала праграму «Няхай заўсёды смяюцца дзеці», але паспець сюды варта да 21.00. і трапіць на сустрэчу з аўтарам кніг Кацярынай Хадасевіч-Лісавой, прычым як на аўтограф-сесію, так і на тэматычны квэст па творчасці дзіцячай пісьменніцы. Альбо завітаць на майстар-клас па японскіх шахматах.

Кожная з бібліятэк будзе здзіўляць і радаваць. Больш падрабязныя праграмы акцыі «Бібліяноч-2025» у выбранай вамі бібліятэцы можна знайсці на іх сайтах ці ў сацыяльных сетках.

ДАРЭЧЫ

# МОЛАДА, ДЫ НЕ ЗЕЛЕНА

**Сацапытанне: больш за 70 % беларускай моладзі адзначае высокую каштоўнасць сям'і**

Сям'я ў структуры каштоўнасцяў беларускай моладзі мае высокую значнасць. Пра гэта паведаміў старшыня Беларускага камітэта маладзёжных арганізацый (БКМА) Павел АЛЕКСА, каментуючы даныя праведзеных сацапытанняў.




У прыватнасці, у верасні-снежні 2024 года БКМА сумесна з цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ і Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі праведзены апытанні аб перавагах беларускай моладзі. У іх прынялі ўдзел 12 тысяч маладых беларусаў з розных рэгіёнаў краіны.

Так, згодна з сацапытаннямі, сям'я ў структуры каштоўнасцяў моладзі мае высокую значнасць, гэта адзначае пераважная большасць апытаных — 70,2 %.

— Больш за 70 % моладзі выказваюцца аб высокай каштоўнасці сям'і. Гэта моцная сям'я, наяўнасць дзяцей у сям'і. Гэта сведчыць аб тым, што маладыя людзі зацікаўлены ва ўмацаванні грамадства, сям'і, традыцыйных каштоўнасцяў беларускага народа, — адзначыў Павел Алекса.

Паводле яго слоў, беларуская моладзь пасталела.

— Калі мы бачым розныя даследаванні, дзе моладзі задаецца пытанне: «Ці гатовыя вы сёння да ўступлення ў шлюб альбо ў які перыяд жыцця?», то нярэдка можна бачыць адказы, што гатовыя пасля заканчэння ўніверсітэта, пасля таго, як цвёрда стануць на ногі, як будуць здольныя забяспечваць сябе і сваіх дзяцей. Тут дастаткова выразна прасочваецца станоўчая дынаміка ў бок сацыяльнай сталасці, г. зн. гатоўнасць стварыць адзінку грамадства, узяць на сябе адказнасць за сябе, сям'ю і, магчыма, за нараджэнне дзяцей. Гэта сведчыць аб сталым выбары сярод моладзі, — дапоўніў Павел Алекса.

Дарэчы, свой дабрабыт беларуская моладзь звязвае з асабістай актыўнасцю.

Як паказалі сацапытанні, чаканні моладзі з боку дзяржавы звязаны з забеспячэннем роўных стартавых магчымасцяў для ўсіх грамадзян. Так, асабісты дабрабыт больш за 85 % рэспандэнтаў звязваюць з актыўнасцю самога чалавека.

— У маладзёжным асяроддзі пераважае разуменне таго, што будучыня толькі ў іх уласных руках і залежыць толькі ад іх саміх. Гэта паказвае на пэўную сталасць маладых людзей, сталасць іх меркаванняў. То-бок, гэта не спажывецкае стаўленне, калі маладыя людзі патрабуюць для сябе нейкіх паблажак, пераваг. Гэта разуменне таго, што ў Беларусі дзейнічаюць эфектыўныя механізмы рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, у кожнага сёння ёсць адкрыты і свабодны доступ да адукацыі, выбару прафесіі, прафесійнага станаўлення, развіцця сваіх патрэб, да самарэалізацыі. Але, вядома, для гэтага неабходна прыкладаць намаганні, — адзначыў Павел Алекса.

Паводле яго слоў, маладыя людзі разумеюць, што любыя даброты — гэта адказнасць.

— Адказнасць за сваё жыццё, развіццё, за дасягненне пастаўленых мэт, вядома, ляжыць на самім чалавеку. І тут усё ў комплексе — выбар адукацыі, прафесіі, усвядомленае стаўленне да грамадства, навакольнага асяроддзя, сямейных каштоўнасцяў і гэтак далей, — падкрэсліў Павел Алекса.

У рамках сацапытанняў у моладзі таксама спыталі пра прыярытэты ў адукацыйным працэсе. Так, у маладзёжным асяроддзі захоўваецца запыт на вялікую практыкаарыентаванасць адукацыйнага працэсу, упор на развіццё прыкладных навыкаў, найбольш запатрабаваных пры працаўладкаванні. Пры гэтым моладзь імкнецца іх атрымаць самастойна (дыстанцыйная адукацыя, трэнінгі) або шляхам больш ранняга ўступлення ў працоўную дзейнасць паралельна з вучобай.

— Як і ва ўсе часы, маладыя людзі — самая актыўная частка насельніцтва, паколькі гэта самы эфектыўны ўзрост для атрымання прафесіі, першага працоўнага вопыту. Запыт на практыкаарыентаванасць адукацыйнага працэсу звязаны з тым, што кожнаму чалавеку, асабліва маладому, хочацца бачыць вынікі сваёй працы. Моладзі ўласцівы нейкі юнацкі максімалізм, жаданне атрымаць вынік «тут і цяпер». Таму, вядома, ёсць попыт на канкрэтныя спецыяльнасці. Гэта ў тым ліку і тэхнічныя спецыяльнасці, прыкладныя навыкі. Таму што малады чалавек выразна бачыць, які від той ці іншай дзейнасці запатрабаваны на рынку працы, — адзначыў Павел Алекса.

Сёння даступная магчымасць павышэння сваёй кваліфікацыі дыстанцыйна.

— Можна паралельна атрымліваць некалькі адукацый, што, дарэчы, мы часта бачым. Студэнты гуманітарных спецыяльнасцяў нярэдка выбіраюць у якасці другой адукацыі эканоміку, юрыдычныя навукі. Грамадства шматграннае, і тыя ці іншыя навыкі, галіны пераклікаюцца. Сёння трэба ўмець выкарыстоўваць свае навыкі ў сучасных тэхналогіях, праграмаванні. І моладзь ужо выразна разумее, дзе яна будзе пасля атрымання таго ці іншага ўзроўню адукацыі, — дапоўніў Павел Алекса.

**Па матэрыялах БелТА.**

ISSN 1990 — 763X

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

АКЦЭНТЫ

# ПРЫКЛАД ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ

**Увага да ўстойлівага збалансаванага развіцця рэгіёнаў: эксперты — аб рабочых паездках Прэзідэнта па краіне**

Перад беларускай дзяржавай стаіць комплексная задача зрабіць рэгіёны, невялікія населеныя пункты прывабным месцам для жыцця і працы, паколькі адным з прыярытэтных кірункаў палітыкі Прэзідэнта Беларусі была і застаецца ўвага да ўстойлівага збалансаванага развіцця рэгіёнаў. Гэта дэманструюць рабочыя паездкі Аляксандра Лукашэнкі па краіне, расказалі эксперты.

## ПРЫВАБНАЕ МЕСЦА ДЛЯ ЖЫЦЦЯ І ПРАЦЫ

**Дэкан факультэта журналістыкі БДУ, палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ** у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» нагадаў, што ў рашэннях леташняга Усебеларускага народнага сходу была пазначана важнасць развіцця рэгіёнаў:

— На працягу года Прэзідэнт неаднаразова адзначаў, што неабходна развіваць менавіта рэгіянальную інфраструктуру. Трэба ствараць камфортныя ўмовы не толькі і не столькі ў сталіцы і іншых буйных гарадах, якія і так ужо забудаваны, а ўладкоўваць жыццё людзей на месцах.



Аляксей Бяляеў канстатуе: наша краіна — гэта цэнтр сельскагаспадарчай вытворчасці:

— Трэба захоўваць людзей там, дзе сканцэнтраваны прадпрыемствы аграрнага тыпу. Жыхары сельскай мясцовасці, невялікіх аграгарадкоў маюць такое ж права на камфортнае жыццё, як і жыхары вялікіх гарадоў. Пытанне стварэння працоўных месцаў. Калі будуць праца, грошы, прыхільнасць да месца, тады будзе і ўся інфраструктура. Прэзідэнт казаў пра тое, што ў кожным раёне павінны з'явіцца цэнтральныя прадпрыемствы, тады падцягнецца і ўсё астатняе: дарогі, дамы, будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў, інфраструктура абслугоўвання.

Эксперт падкрэсліў, што беларускі лідар не проста пастаянна ўдзяляе ўвагу рэгіянальнаму развіццю, але і патрабуе, каб яно было якасным:

— Не проста цяп-ляп для паказухі. Павінны быць створаны рэальныя магчымасці для людзей працаваць, зарабляць добрыя грошы.

Перад беларускай дзяржавай стаіць комплексная задача, растлумачыў госць эфіру:

— Трэба зрабіць рэгіёны прывабным месцам для жыцця і работы, месцам, дзе хочацца заставацца. Толькі 20 % насельніцтва жыве ў сельскай мясцовасці, а гэта значыць, што велізарная колькасць зямлі, прыроды аказваецца не пад кантролем. Вельмі важна, каб людзі на зямлі жылі, працавалі. Для гэтага іх трэба зацікаўліваць, ствараць камфортныя ўмовы.

Аляксей Бяляеў перакананы: паездкі Прэзідэнта па невялікіх мястэчках — гэта цэнтралізаваны збор матэрыялаў для аналізу і прыняцця канчатковых рашэнняў па развіцці рэгіёнаў:

— Нічога экстраардынарнага, проста выкананне паўсядзённых абавязкаў, кантроль за выкананнем раней вылучаных патрабаванняў.

## ЭКЗАМЕН ДЛЯ ЎЛАДЫ



З меркаваннем калегі салідарны і **палітолаг Андрэй ЛАЗУТКІН**, агучыўшы сваё бачанне ў эфіры тэлеканала «СТБ»:

— Кожны губернатар, кожная вобласць, кожны раён — гэта людзі, якія праходзяць пэўную праверку. Трэба паказаць, ці добры вы губернатар, ці добры вы прэм'ер-міністр, што вы ўмееце, як вы будзеце ўсё гэта вырашаць.

Эксперт падкрэслівае, што пры кожным назначэнні, якое адбываецца сёння на ўзроўні нават раёнаў, кандыдатаў выклікаюць у Палац Незалежнасці:

— Прэзідэнт звяртаецца да кожнага, не важна, размова пра Копысь або раёны Мінска. Гэта значыць, ён ведае пункты, дзе ёсць пэўная неабходнасць дзяржаўнага ўдзелу. І для ўлады ідзе такі іспыт: давайце, вы маладыя, хочаце атрымаць больш улады, пакажыце, як вы будзеце вырашаць нашы беларускія праблемы. Для гэтага Прэзідэнту трэба праводзіць праверку дадзенай кантрольнай работы.

Андрэй Лазуткін тлумачыць: менавіта для гэтага кіраўнік дзяржавы асабіста прыязджае ў рэгіёны і кантралюе выкананне даручэнняў: «Я даручаў вам, умоўна, фермы закапаць закінутыя, а вы іх закапалі? Ці вы нават гэта не можаце зрабіць, гэта значыць навесці парадак на зямлі?»

І вось так ідзе пастаянная праверка дзяржапарату, якая працуе на Прэзідэнта. І па выніках такой кантрольнай работы, якая пішацца не 45 хвілін, а 5 гадоў, па сутнасці, увесь наступны прэзідэнцкі тэрмін кіраўнік дзяржавы будзе рабіць нейкія высновы.

Палітолаг дапаўняе: гаворка пра канфігурацыю ўлады:

— Каго, можа быць, трэба трошкі павысіць, каго панізіць. І гэта не проста пра якасць прадукцыі і чагосьці яшчэ. Трэба ўнутры краіны вызначыцца, што ёсць і які патэнцыял у нашых беларускіх кадраў.

## АДЗІНСТВА СЯМІ «Я»

Што датычыцца непасрэдна наведвання Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці, **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА** падкрэслівае, што асноўная ўвага Прэзідэнта была сфакусіравана на рабоце аграпрамысловага комплексу раёна:

— У перспектыве плануеццаператварыць Шклоўскі раён ва ўзорна-паказальны, своеасаблівую матрыцу, на аснове якой будзе вызначаны вобраз будучыні для іншых раёнаў краіны.

Парламентарый адзначае, што пытанне ўмацавання рэгіёнаў, стварэння новых вытворчасцяў і мадэрнізацыі старых прадпрыемстваў, паляпшэння ўмоў для вядзення прыватнага бізнесу, у тым ліку прыцягнення інвестыцый у эканоміку, заўсёды займае прыкметнае месца ў прэзідэнцкай палітыцы:

— Ды і ў перадвыбарнай праграме нашага Прэзідэнта палажэнне аб раўнамерным развіцці рэгіёнаў па прынцыпе «моцныя рэгіёны — моцная краіна» з улікам іх мясцовай спецыфікі з'яўляецца адным з фундаментальных кампанентаў праграмы мадэрнізацыі краіны ва ўмовах узнікнення новых геапалітычных і геаэканамічных выклікаў і пагроз.

Менавіта таму, падкрэслівае парламентарый, Прэзідэнтам пастаўлены канкрэтныя задачы па пераўтварэнні сельскай гаспадаркі ў высокатэхналагічную, канкурэнтаздольную галіну і прэстыжную сферу працы, развіцці сацыяльнай інфраструктуры ў сельскай мясцовасці, прыцягненні кадраў у аграпрамысловы комплекс, а для гэтага неабходна забяспечыць людзей высокааплатнай работай і жыллём. Важнае значэнне мае таксама развіццё транспартнай інфраструктуры, лагістыкі, якая прадугледжвае будаўніцтва сучасных дарог па лініі «абласны цэнтр — раённы цэнтр — аграгарадок».



— Найскладанейшае пытанне сёння — захаваць баланс працоўных рэсурсаў паміж сталіцай і абласнымі цэнтрамі, з аднаго боку, і раёнамі, асабліва якія знаходзяцца на рэгіянальных ускраінах, з другога, — працягвае Алег Дзячэнка. — Усе разумеюць — працоўная міграцыя з'явілася не сёння і не ўчора. Недахоп кадраў на прадпрыемствах і ў арганізацыях сталіцы спараджае новыя міграцыйныя патокі ў краіне. Таму пытанне з замацаваннем кадраў у рэгіёнах варта вырашаць у комплексе з ліквідацыяй праблемы кадравага «голаду» ў Мінску і абласных цэнтрах.

На думку суразмоўцы, дасягненне пастаўленых мэт шмат у чым будзе абумоўлена рэалізацыяй Указа № 74 «Аб узмацненні ролі старшыняў выканаўчых камітэтаў базавага ўзроўню ў развіцці рэгіёнаў» і вось чаму:

— Пераразмеркаванне ўладных паўнамоцтваў, узмацненне пазіцый кіраўнікоў органаў выканаўчай улады на месцах у частцы аператыўнага кіравання працэсамі ў сферы эканомікі і грамадска-палітычнага жыцця вырашае, акрамя эфектыўнага менеджменту, яшчэ адну стратэгічную для краіны задачу — выхаванне кіраўнікоў новай фармацыі, якія ў далейшым змогуць на больш высокім узроўні самастойна прымаць правільныя рашэнні.

Значэнне мер, што прымаюцца на ўзроўні кіраўніка дзяржавы па ўдасканаленні аграпрамысловага комплексу, эканомікі ў цэлым, парламентарый праілюстраваў на прыкладзе развіцця аб'ектаў Магілёўшчыны, у прыватнасці, Асіповіцкай выбарчай акругі № 89, народным выбраннікам ад якой з'яўляецца:

— Напрыклад у Клічаўскім раёне ў УКСП «Саўгас «Добраахвотнік» вядзецца будаўніцтва цэха па сушцы біямас, дзе запланавана атрыманне гранул з травяной мукі і будуць створаны новыя працоўныя месцы. Паблізу вёскі Дулебня ўзводзіцца малочнатаварны комплекс на 1512 галоў, а таксама рэканструюецца малочнатаварны комплекс на 536 галоў у «Саўгасе «Ольса», што ў сукупнасці прывядзе да павелічэння валавой вытворчасці малака. Ствараюцца новыя працоўныя месцы, людзі забяспечаны жыллём. Раён развіваецца, адпаведна развіваецца і наша краіна.



У сваю чаргу **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, гендырэктар «Цэнтра культуры «Віцебск», дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» Глеб ЛАПІЦКІ** звяртае ўвагу на нязменны тэзіс кіраўніка дзяржавы, што Беларусь — гэта адзінства сямі «я», шасці абласных цэнтраў і сталіцы:

— У словах Прэзідэнта выразна прасочваецца паслядоўная стратэгія развіцця малых населеных пунктаў, бо менавіта там сканцэнтравана душа беларускага народа, захоўваюцца яго традыцыі і велізарны, пакуль яшчэ не цалкам раскрыты, патэнцыял.

Сенатар падкрэслівае: усе ініцыятывы Прэзідэнта накіраваны на пошук і мабілізацыю рэсурсаў у гэтых рэгіёнах:

— Беспрэцэдэнтная падтрымка, якая аказваецца ў аднаўленні малых населеных пунктаў, развіцці аграгарадкоў, а таксама рэалізацыя ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект», накіраванай на прыцягненне інвестыцый, дазваляе не толькі палепшыць эканамічную сітуацыю, але і прыцягнуць увагу да добраўпарадкавання гэтых тэрыторый, зацікавіць буйны бізнес у развіцці малых населеных пунктаў. Такім чынам, далейшае развіццё бачыцца менавіта ў гэтым кірунку. І, вядома, пры зносінах з людзьмі ключавымі застаюцца пытанні жылля, дарог і працоўных месцаў. Калі ўдасца забяспечыць гэтыя тры складнікі, і, упэўнены, па даручэнні кіраўніка дзяржавы гэтаму будзе ўдзелена яшчэ больш увагі, то і наладзіцца інфраструктура, і з'явіцца неабходнае жыллё для работнікаў прадпрыемстваў, размешчаных у гэтых населеных пунктах.

Што датычыцца Віцебскай вобласці, сенатар адзначае:

— Нягледзячы на адносна невысокую стартавую базу важна адзначыць працавітасць жыхароў Віцебшчыны, якія, перакананы, паспяхова справяцца з усімі выклікамі і пастаўленымі задачамі, а таксама будуць імкнуцца да павелічэння тэмпаў росту і далейшага развіцця рэгіёна.

## МАЛЫМ ГАРАДАМ — АСАБЛІВАЯ ЎВАГА



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар Гомельскага ГВРУП «Фармацыя» Людміла САПЕГА**, звяртаючыся да вытокаў праблематыкі рэгіёнаў нагадвае, што масавы пераезд насельніцтва Беларусі ў гарады пачаўся прыблізна ў сярэдзіне 60-х гадоў мінулага стагоддзя:

— Тады такі працэс быў эканамічна апраўданы. У краіне, дзе да гэтага каля 65 % насельніцтва пражывала ў сельскай мясцовасці, ішло бурнае прамысловае будаўніцтва. Чэрпаць працоўныя рэсурсы акрамя як з вёсак, пасёлкаў гарадскога тыпу і райцэнтраў, новым фабрыкам і заводам проста не было дзе.

У цяперашні час, працягвае член Савета Рэспублікі, такой патрэбы ў працоўных руках у буйных гарадах не назіраецца:

— Аднак адток жыхароў з сельскай мясцовасці працягваецца. Невыпадкова яшчэ чатыры гады таму, выступаючы на VI Усебеларускім народным сходзе, Прэзідэнт ужо біў трывогу ў сувязі з той сітуацыяй, якая складвалася ў краіне. Тады ён перасцерагаў ад празмернага захаплення будаўніцтвам жылля ў Мінску, што пагражае перанасяленнем сталіцы. Літаральна ж днямі, падчас свайго знаходжання ў аграгарадку Копысь, Аляксандр Лукашэнка ўжо ў катэгарычнай форме запатрабаваў спыніць бяздумна будаваць і сцягваць людзей у буйныя гарады, прапанаваў будаваць жыллё толькі там, дзе на гэта ёсць запыт ад работадаўцаў. А каб гэты попыт быў, у кожным райцэнтры на працягу найбліжэйшых пяці гадоў павінны быць створаны ўласныя вытворчасці, якія як здабываюць, так і арыентаваныя на перапрацоўку і выпуск прадукцыі з мясцовай сыравіны.

Сенатар звяртае ўвагу і на адначасовае патрабаванне кіраўніка дзяржавы, каб пераезд гараджан на пастаяннае месца жыхарства ў сельскую мясцовасць ні ў якім разе не быў звязаны са зніжэннем звыклага ўзроўню дабрабыту і камфорту:

— У аграгарадках, гарадскіх пасёлках і гарадах-спадарожніках павінны быць створаны ўсе ўмовы, каб чалавек не адчуваў сябе адарваным ад цывілізацыі. Краіна ў нас не такая вялікая, з развітой сацыяльнай і транспартнай інфраструктурай. І з Прэзідэнтам, які ўмее бачыць перспектыву на гады наперад.



З гэтым салідарны і **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Андрэй БАЛЫШ**, які канстатаваў: чарговае наведванне Віцебскай і Магілёўскай абласцей зноў пацвердзіла важнасць падтрымкі мясцовых вытворчасцяў, развіцця інфраструктуры і сацыяльнай сферы для забеспячэння стабільнасці і працвітання ўсіх куткоў краіны:

— Асаблівую ўвагу падчас паездкі ў Віцебскую і Магілёўскую вобласці Прэзідэнт удзяліў дрэваапрацоўцы, сельгасперапрацоўцы і іншым галінам, якія фарміруюць эканамічны каркас рэгіёнаў. Прэзідэнт асабліва падкрэсліў, што развіццё такіх вытворчасцяў — гэта не толькі эканоміка, але і замацаванне людзей на месцах, прадухіленне адтоку кадраў у буйныя гарады. Але без камфортных умоў немагчыма ўтрымаць спецыялістаў у малых гарадах і сельскай мясцовасці. Таму важным аспектам стабільнасці кадраў з'яўляецца даступнае жыллё: будаўніцтва для работнікаў, арэнднае і сацыяльнае жыллё.

На думку парламентарыя, такі падыход спрыяе не толькі паляпшэнню дэмаграфічнай сітуацыі, але і фарміраванню кадравага рэзерву для мясцовай эканомікі.

— Немалаважным фактарам таксама з'яўляецца развітая інфраструктура і сацыяльная сфера, каб максімальна скараціць разрыў паміж горадам і перыферыяй, — звяртае ўвагу ён. — Такім чынам, увага Аляксандра Лукашэнкі да рэгіянальнай палітыкі — гэта не проста падтрымка асобных прадпрыемстваў, а стратэгічны курс на фарміраванне моцнай, незалежнай і адзінай Беларусі, дзе кожны рэгіён уносіць уклад у агульны росквіт і дабрабыт будучых пакаленняў.

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

# УКЛАСЦІСЯ ВА ЎСТАНОЎЛЕНЫЯ ТЭРМІНЫ І ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЫКАНАЛЬНІЦКУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ

**Васіль ГЕРАСІМАЎ — аб выніках дзейнасці Камітэта дзяржкантролю за мінулы год і ключавых задачах на перспектыву**

Як адзначыла на сумесным пасяджэнні дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, парламент і Камітэт дзяржаўнага кантролю эфектыўна ўзаемадзейнічаюць для вырашэння мэтавых задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы, і рэалізацыі нацыянальных прыярытэтаў развіцця нашай краіны. Па словах спікера, парламентарыі нязменна ўлічваюць пазіцыю ведамства ў законапраектнай дзейнасці, якая заўсёды практыкаарыентаваная і абгрунтаваная.



Як звярнуў увагу старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю, летась работа ведамства была засяроджана на забеспячэнні эканамічнай бяспекі дзяржавы. Асноўная ўвага ўдзялялася кантролю за выкананнем бюджэту, выкарыстаннем дзяржаўных сродкаў, выяўленнем рэзерваў павелічэння аб'ёмаў вытворчасці, загрузкай магутнасцяў, асваеннем выпуску новай прадукцыі і інш.

«Як даручалася кіраўніком дзяржавы, апошнім часам упор у кантрольнай дзейнасці робіцца на дзейсную прафілактыку, — акцэнтаваў увагу Васіль Герасімаў. — За апошнія чатыры гады колькасць кантрольных мерапрыемстваў усіх відаў знізілася: праверак і мерапрыемстваў тэхнічнага характару — амаль у два разы, маніторынгаў — амаль у пяць разоў». Пры гэтым, па словах старшыні КДК, адзначаецца тэндэнцыя зацікаўленасці суб'ектаў у аператыўнай ліквідацыі выяўленых парушэнняў.

## АКЦЭНТ — НА ПРАФІЛАКТЫЦЫ

«У нас на кантролі больш за палову ўсіх даручэнняў Прэзідэнта, якія маюць стратэгічнае і найважнейшае значэнне для ўстойлівага развіцця краіны і паляпшэння дабрабыту грамадзян, — паведаміў старшыня Камітэта дзяржкантролю. — Наша адзіная з выканаўцамі задача — укласціся ва ўстаноўленыя тэрміны, забяспечыць якасць, выканальніцкую дысцыпліну, каб колькасць нявыкананых даручэнняў імкнулася да нуля».

Што датычыцца выканальніцкай дысцыпліны, у гэтым пытанні, па словах Васіля Герасімава, ёсць аб'ектыўныя цяжкасці. Ён адзначыў, што ў шэрагу выканаўцаў да гэтага часу захоўваецца расслабленасць, цяганіна і нават фармальны падыход. Па розных прычынах зацягваюцца і неаднаразова пераносяцца тэрміны выканання даручэнняў, што аказвае негатыўны ўплыў на сітуацыю ў эканоміцы, сацыяльнай сферы і не адпавядае чаканням людзей. З боку ведамства за кожным даручэннем кантроль будзе больш жорсткім, яшчэ і з улікам патрабаванняў аб персанальнай адказнасці кіраўнікоў і непасрэдных выканаўцаў даручэнняў у кантэксце палажэнняў Дырэктывы № 11.

Што датычыцца сітуацыі на спажывецкім рынку, органамі камітэта праверкам і маніторынгам было падвергнута больш за 1400 аб'ектаў гандлю, уключаючы аб'екты грамадскага харчавання. Парушэнні ўстаноўлены амаль у 90 %, да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 986 службовых асоб, сума штрафаў склала амаль 7 млн руб. У тых выпадках, калі парушэнні з'яўляліся грубымі і датычыліся бяспекі або здароўя грамадзян, ведамствам прымаліся самыя жорсткія меры, у тым ліку рашэнні аб прыпыненні работы аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання.

У полі зроку КДК — аграпрамысловы і прыродаахоўны комплексы. Па выяўленых фактах безгаспадарлівасці пры падрыхтоўцы сельгасарганізацый да пасяўной кампаніі за мінулы год да розных відаў адказнасці прыцягнута больш як 400 вінаватых асоб.

«На пастаянным кантролі пытанні жывёлагадоўлі, у тым ліку падзеж жывёлы, захаванне колькасці пагалоўя, забеспячэнне належнай селекцыйна-племянной работы па ўзнаўленні статка, рэалізацыі прадукцыі, — удакладніў старшыня Камітэта дзяржкантролю. — Асаблівая ўвага ўдзяляецца кантролю за выкананнем даручэнняў кіраўніка дзяржавы, якія датычацца меліярацыі і эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў, што выдзяляюцца на гэтыя мэты».

## ЯКАСЦЬ ПРАДУКЦЫІ І НАДЗЕЙНАСЦЬ ТЭХНІКІ

На асаблівым кантролі знаходзяцца пытанні поўнай і эфектыўнай перапрацоўкі драўніны ўнутры краіны. Па ініцыятыве камітэта падыходы рэалізацыі драўніны ў нарыхтаваным выглядзе фізічным асобам перагледжаны, адказнасць за нямэтавае яе выкарыстанне суб'ектамі гаспадарання стала больш жорсткай. Прадоўжаны кантроль за ўцягваннем у гаспадарчы абарот астаткаў нізкаякаснай драўніны, навядзеннем парадку ў лясах, своечасовым лесааднаўленнем участкаў ляснога фонду, выяўленнем неэфектыўных затрат. На асаблівым кантролі застаюцца пытанні, што датычацца распрацоўкі пашкоджаных лясных насаджэнняў у выніку ўраганаў, якія прайшлі летам мінулага года, у тым ліку своечасовасці правядзення лесакультурных работ на такіх участках.

Што датычыцца якасці і надзейнасці айчыннай тэхнікі, аналітычныя матэрыялы камітэта ляглі ў аснову праведзенай у верасні мінулага года калегіі Міністэрства прамысловасці, па выніках якой прыняты Комплексны план мерапрыемстваў па ліквідацыі заўваг спажыўцоў і кантралюючых органаў да якасці і сэрвісу тэхнікі. Выяўлены праблемныя пытанні і ў развіцці айчынных прадпрыемстваў станкабудавання. Па прапанове камітэта распрацавана Стратэгія развіцця станкабудаўнічай галіны і прыярытэтныя кірункі яе далейшага функцыянавання. Распрацаваны комплекс мер па павелічэнні загрузкі і фінансавым аздараўленні прадпрыемстваў легпрама, зніжэнні іх расходаў, нарошчванні прысутнасці айчыннай прадукцыі на ўнутраным і знешніх рынках.

## ЗНІЖЭННЕ ЗВЫШНАРМАТЫЎНЫХ АБ'ЕКТАЎ КАПРАМОНТУ І СКАРАЧЭННЕ ДАЎГАБУДАЎ

На асаблівым кантролі — пытанні выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы па максімальным спрашчэнні будаўніцтва, павышэнні яго якасці. «Летась часткова рэалізаваны ўнесеныя камітэтам прапановы: скарочаны асобныя адміністрацыйныя працэдуры і ўзгадненні, спрошчаны парадак зносу аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца», — праінфармаваў кіраўнік ведамства.



Па словах старшыні КДК, узнята пытанне парадку спрошчанага ўзвядзення сядзібных дамоў, які не дзейнічае з-за немагчымасці іх падключэння да інжынернай інфраструктуры без наяўнасці праектнай дакументацыі. Праект указа па ўрэгуляванні гэтых працэсаў на завяршальнай стадыі ўзгаднення.

Адзін з найважнейшых кірункаў дзейнасці — кантроль за якасцю выканання даручэнняў у сферы ЖКГ. Рэалізацыя прапаноў камітэта дазволіла актывізаваць работу мясцовых органаў улады па забеспячэнні належнага выканання заявак грамадзян, накіраваных па адзіным нумары 115, а таксама па падключэнні да аўтаматызаванай сістэмы іх уліку ўсіх выканаўцаў жыллёва-камунальных паслуг.

Прадоўжана работа па навядзенні парадку ў сферы капрамонту жылля. Як расказаў старшыня Камітэта дзяржкантролю, у цэлым па краіне колькасць звышнарматыўных аб'ектаў капрамонту жылфонду за 2024 год знізілася практычна ў два разы, колькасць фактаў яго спынення без выканання ў поўным аб'ёме прадугледжаных праектамі работ — з 92 да 52.

У 2024 годзе працягваўся кантроль за навядзеннем парадку з даўгабудамі. Пад пільнай увагай камітэта знаходзілася работа дзяржорганаў у гэтым кірунку. Як вынік, за чатыры гады пяцігодкі колькасць даўгабудаў скарацілася на 4066 адзінак, або на 91 % ад агульнай колькасці.

## У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЯКАСЦІ ВА ЎСІМ

Адным з асноўных кірункаў работы КДК з'яўляецца кантроль за выкананнем даручэнняў кіраўніка дзяржавы ў сацыяльнай сферы. У 2024 годзе праведзены кантрольныя мерапрыемствы па пытаннях абгрунтаванасці фарміравання цэн (тарыфаў) на лекавыя прэпараты і медыцынскія паслугі, платнай адукацыі ва ўстановах вышэйшай адукацыі, аптымізацыі штатнай колькасці бюджэтных арганізацый сацыяльнай сферы.

«У сістэме адукацыі на кантролі камітэта былі пытанні працаўладкавання і кампенсацыі выпускнікамі сродкаў, затрачаных дзяржавай на іх падрыхтоўку ў выпадку неадпрацоўкі імі ўстаноўленага тэрміну работы па размеркаванні, — канкрэтызаваў кіраўнік ведамства. — Выяўлены ўзаемазвязаныя арганізацыі, якія аказваюць паслугі па фіктыўным працаўладкаванні выпускнікоў».

На пастаянным кантролі Камітэта дзяржкантролю знаходзіцца пытанне своечасовасці выплаты заработнай платы. Ва ўрад накіраваны прапановы па ўстанаўленні адміністрацыйнай адказнасці за несвоечасовую выплату па належна выкананых дагаворах.

Усяго ў 2024 годзе органамі фінансавых расследаванняў камітэта выяўлена 271 злачынства па фактах ухілення ад выплаты падаткаў, што складае прыкладна 94 % ад выяўленых усімі праваахоўнымі органамі злачынстваў гэтай катэгорыі. Выпадкі выплаты заработнай платы «ў канвертах» задакументаваны адносна парадку 3,5 тысячы работнікаў камерцыйных арганізацый. Па фактах ухілення ад выплаты падаходнага падатку і абавязковых страхавых узносаў выяўлена 121 злачынства.

Кажучы аб спыненні каналаў фінансавання экстрэмісцкай і тэрарыстычнай дзейнасці, Васіль Герасімаў звярнуў увагу на тое, што асноўныя намаганні былі сканцэнтраваны на аналізе абароту крыптавалют і кантролі плацежных сэрвісаў розных электронных сістэм і сацсетак. Таксама выяўляліся злачынствы эканамічнага характару, якія ўчыняюцца датычнымі да дэструктыўнай дзейнасці грамадзянамі: летась выяўлены 34 такія злачынствы.

Як рэзюмаваў Васіль Герасімаў, прыярытэтны кірунак работы органаў камітэта сёлета — максімальна дабівацца выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы. «Працягнем кантраляваць расходаванне бюджэтных сродкаў, — канкрэтызаваў ён. — Упор зробім на аналізе эфектыўнасці дзяржпраграм, пошуку рэзерваў і жорсткай эканоміі дзяржаўных сродкаў на ўсіх узроўнях і ў розных галінах. Асаблівую ўвагу ўдзелім выкарыстанню сродкаў у сацыяльнай сферы. У сферы матэрыяльнай вытворчасці на асаблівым кантролі з улікам пяцігодкі якасці — забеспячэнне якасці ва ўсіх галінах эканомікі і сацыяльнай сферы».

**Веранiка КАНЮТА. Фота БелТА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ЭНЕРГЕТЫЧНАЯ БЯСПЕКА, ПАДАТКОВАЯ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ І НОВЫЯ ПАЎНАМОЦТВЫ РЫЭЛТАРАЎ

**Учора адбыліся сесіі палат Парламента, на якіх быў разгледжаны шэраг законапраектаў**

Перад пасяджэннем другой сесіі ў Савеце Рэспублікі прэзентавалі чарговы праект сенатарскага корпусу, прымеркаваны да 80-годдзя Вялікай Перамогі. Экспазіцыя «Хлеб — нябачная сіла Перамогі» сведчыць аб подзвігу супрацоўнікаў хлебазаводаў, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны кармілі краіну. Студэнты Дзяржаўнага каледжа хлебапячэння прэзентавалі пяць відаў хлеба, прыгатаванага па рэцэптурах ваеннага часу, а спецыялісты КУП «Мінскхлебпрам» прадставілі разнастайныя гатункі сучаснага хлеба, кандытарскіх вырабаў.



Фота БелТА.

## НАРОШЧВАННЕ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі ўчора на сесіях палат Парламента ратыфікавалі Пратакол аб унясенні змяненняў у Пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Расійскай Федэрацыі аб мерах па ўрэгуляванні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў галіне экспарту нафты і нафтапрадуктаў ад 12 студзеня 2007 года. Прадугледжана падаўжэнне тэрміну дзеяння пагаднення да 31 снежня 2026 г. і пры гэтым яго аўтаматычнае падаўжэнне пасля 31 снежня 2026 г. на наступныя гадавыя перыяды, калі ніводны з бакоў не паведаміць за тры месяцы да заканчэння чарговага гадавога перыяду другому боку аб сваім намеры спыніць дзеянне пагаднення.

Адмяняецца канкрэтны тэрмін дзеяння нормы аб штогадовым уключэнні ў індыкатыўныя балансы нафты сырой, прызначанай для Рэспублікі Беларусь у аб'ёме 24 млн тон, якая пастаўляецца трубаправодным і іншымі відамі транспарту. Цяпер гэта норма дзейнічае на перыяд дзеяння пагаднення. Рэалізацыя пратакола дасць магчымасць у мэтах павышэння энергетычнай бяспекі Беларусі працягнуць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з Расіяй у галіне паставак нафты і нафтапрадуктаў у нашу краіну.

Як звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА, прыняцце пратакола мае важнае значэнне ў забеспячэнні энергетычнай бяспекі нашай краіны і далейшым нарошчванні беларуска-расійскага ўзаемадзеяння ў гандлёвай сферы. «Расія — наш асноўны гандлёвы партнёр, — падкрэсліў спікер. — У мінулым годзе на яе долю прыпадала звыш 60 % знешняга гандлю таварамі. Адпаведна, аб'ём тавараабароту павялічыўся больш як на 6 % і склаў амаль 52 мільярды долараў».

## РЫЭЛТАРСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ — ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

Члены Савета Рэспублікі адобрылі законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях падаткаабкладання», які прадугледжвае канкрэтызацыю перыяду, на працягу якога грамадзянін не мае права працягваць дзейнасць у статусе індывідуальнага прадпрымальніка. Маецца на ўвазе, калі памер яго даходаў і (або) выручкі на працягу каляндарнага года перасягнуў 500 тысяч беларускіх рублёў. Гэты перыяд устанаўліваецца на тры каляндарныя гады.

Праектам Закона «Аб рыэлтарскай дзейнасці», які таксама разгледзелі на сесіі Савета Рэспублікі, прадугледжана стварэнне органа самакіравання рыэлтарскай супольнасці — Палаты рыэлтараў, надзяленне яго кампетэнтнымі паўнамоцтвамі. Скасоўваецца інстытут агентаў па аперацыях з нерухомасцю. Аказанне рыэлтарскіх паслуг ускладваецца на членаў Палаты рыэлтараў, якія прайшлі спецыяльную падрыхтоўку і атрымалі пасведчанне аб атэстацыі рыэлтара па выніках здачы экзамену. Мяняюцца падыходы да кваліфікацыйных патрабаванняў рыэлтараў: цяпер, каб займацца рыэлтарскай дзейнасцю, неабавязкова мець профільную адукацыю, але абавязковае праходжанне кандыдатам у рыэлтары навучальных курсаў у сферы нерухомасці.

Як звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, па даручэнні Прэзідэнта законапраект «Аб рыэлтарскай дзейнасці» разглядаўся на пасяджэнні экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі, дзе былі выказаны заўвагі і прапановы. «Пытанне разглядалася з запрашэннем шырокага кола экспертаў, якія займаюцца гэтай дзейнасцю, прадстаўнікоў рыэлтарскай супольнасці, — удакладніла спікер. — Гэтыя пытанні патрабавалі ўрэгулявання. На рынку рыэлтарскіх паслуг працуюць людзі, якія часам паводзяць сябе не вельмі добрасумленна. Таму былі выказаны розныя прапановы, у тым ліку па пытанні скасавання інстытута агентаў па аперацыях з нерухомасцю і стварэння Палаты рыэлтараў».

Членамі Савета Рэспублікі разгледжаны Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Дагавор аб заснаванні Еўразійскага фонду стабілізацыі і развіцця ад 9 чэрвеня 2009 года». Ратыфікаваны Пратакол аб унясенні змяненняў у Дагавор дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў аб міжнародным вышуку асоб ад 10 снежня 2010 года, Пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Рэспублікі Філіпіны аб адмене візавых патрабаванняў для ўладальнікаў дыпламатычных і службовых пашпартоў.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ВЯЛІКІ ПАСТЫР СВЕТУ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА і Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА наведалі Апостальскую нунцыятуру ў Мінску, дзе пакінулі запісы ў кнізе спачуванняў у сувязі са смерцю Папы Рымскага Францыска, паведамляе БелТА.

У сваім запісе Наталля Качанава выказала глыбокія спачуванні ад імя Савета Рэспублікі і ад сябе асабіста. «Папа Францыск назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах як вялікі пастыр свету, паслядоўны прыхільнік міжканфесійнага дыялогу. Мы высока цэнім яго служэнне Богу і людзям, яго добрыя адносіны да Беларусі. Пантыфік унёс неацэнны ўклад у забеспячэнне сацыяльнай роўнасці і справядлівасці, прысвяціўшы ўсё сваё жыццё ўмацаванню веры і гуманнасці. Няхай яго душа знойдзе спакой, а ўнікальная спадчына прадаўжае жыць і натхняць людзей на добрыя справы», — напісала Наталля Качанава.

Ігар Сергяенка ў сваім спачуванні ад імя дэпутатаў і сябе асабіста падкрэсліў: «Сціплы і адданы ідэалам служэння, Яго Святейшаства заўсёды прытрымліваўся неаспрэчных гуманістычных каштоўнасцяў у сваіх пасланнях, прапаведуючы любоў да бліжняга, спагаду, міласэрнасць. Папа Францыск карыстаўся шчырай любоўю мільёнаў людзей, якія падтрымлівалі яго ў закліках да сацыяльнай справядлівасці, адзінства, разумення і міру. У нашай памяці аб ім мы будзем захоўваць самую глыбокую павагу да яго асобы і яго спраў».

* * *

Учора таксама члены Савета Рэспублікі на чале з Наталляй Качанавай ушанавалі памяць герояў, якія цаной свайго жыцця абаранілі свабоду і незалежнасць Радзімы, вярнулі мір чалавецтву. Сенатары ўсклалі кветкі ў мемарыяльным комплексе «Масюкоўшчына».

# «ЗАХАВАЕМ МІР ДЛЯ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ І ЎНУКАЎ!»

**Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь прыняў заяву ў сувязі з 80-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гадоў**

«Мы, парламентарыі, звяртаемся да міжнароднай супольнасці ў азнаменаванне 80-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гадоў. Гэты юбілей з'яўляецца не толькі падставай для ўрачыстасцяў, але і важным напамінам аб каштоўнасці міру, свабоды і чалавечага жыцця.

Вялікая Айчынная вайна стала адным з самых трагічных і гераічных перыядаў у сусветнай гісторыі. Яна забрала мільёны жыццяў, пакінула глыбокія раны ў сэрцах людзей і змяніла лёсы цэлых народаў. Беларусь — жывы помнік тым страшным падзеям. Наша краіна першай прыняла на сябе разбуральны ўдар нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ад рук акупантаў загінуў кожны трэці яе жыхар, тысячы населеных пунктаў былі разбураны і спалены датла. Фашысты праводзілі палітыку генацыду беларускага народа, знішчаючы яго ў шматлікіх лагерах смерці, доследных лабараторыях, газавых камерах, жывымі спальваючы ў дамах. Карнікі не шкадавалі ні дзяцей, ні жанчын, ні старых. Кожны сантыметр беларускай зямлі паліты крывёй яе жыхароў і абаронцаў Айчыны.

Сёння, праз 80 гадоў, свет сутыкаецца з новымі маштабнымі выклікамі і пагрозамі, у тым ліку ў галіне бяспекі. Канфлікты, тэрарызм, эканамічныя крызісы і палітычныя рознагалоссі ствараюць напружанасць у міжнародных адносінах, што можа прывесці да непапраўных наступстваў. Спробы перапісаць гісторыю, абяліць нацызм, гераізаваць фашыстаў і іх памагатых недапушчальныя! Мы, нашчадкі пакалення пераможцаў, абавязаны абараніць гістарычную праўду. Захаванне памяці аб вялікім подзвігу народаў, якія супрацьстаялі фашызму, з'яўляецца залогам непаўтарэння новых маштабных кровапралітных войнаў і канфліктаў.

Парламентам усіх дзяржаў неабходна аб'яднаць намаганні ў барацьбе за мір, умацоўваць міжнароднае супрацоўніцтва, падтрымліваць дыялог і добрасуседскія адносіны, знаходзіць кампрамісы нават у самых складаных сітуацыях.

Мір — гэта не проста адсутнасць вайны, а жыццё ў бяспецы і гармоніі. Беларусь, якая адчула жахі вайны, заўсёды выступала і будзе выступаць за палітыка-дыпламатычнае ўрэгуляванне канфліктаў, умацаванне міжнароднай бяспекі і ўзаемапаважлівага дыялогу паміж дзяржавамі. Верым, што толькі сумеснымі намаганнямі можна пераадолець глабальныя выклікі і забяспечыць устойлівае развіццё для ўсіх народаў.

У гэты знамянальны дзень заклікаем успомніць пра тое, што аб'ядноўвае нас, — пра імкненне да міру, справядлівасці і дабрабыту. Няхай святая памяць аб бяспрыкладным подзвігу, мужнасці і гераізме савецкага і іншых народаў, якія змагаліся з фашызмам, натхняе нас на стваральную працу ў імя будучыні, у якой няма месца войнам і пакутам.

Захаваем мір для нашых дзяцей і ўнукаў!»

## «МІР ПАВІНЕН БЫЦЬ У КОЖНАЙ КРАІНЕ»

Па словах **Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ**, заява Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у сувязі з 80-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гадоў прынята, каб у чарговы раз нагадаць парламентарыям усіх краін аб тым, што важна для нашай краіны, як для любой іншай. «Гэта самае галоўнае — мір і спакой, — падкрэсліла спікер. — Мы ў гэтай заяве гаворым аб тым, што перажыла наша краіна. Гэта боль, пакуты. Гэта захаванне той гістарычнай памяці, якую мы пранеслі праз гэтыя гады, усе 80 гадоў. І я ўпэўнена, мы будзем перадаваць яе з пакалення ў пакаленне».

Спікер адзначыла, што ў гісторыі Беларусі засталося яшчэ нямала «белых плямаў». «Генацыд беларускага народа, які проста знішчалі, знішчалі нашу краіну, сціралі з зямлі, — удакладніла Наталля Качанава. — Але беларускі народ выстаяў. Ён зрабіў усё, аб'яднаўшыся з усімі народамі, якія насялялі былы Савецкі Саюз, каб абараніць мір і свабоду. Таму мы сёння яшчэ раз звяртаемся да сусветнай супольнасці, да ўсіх людзей добрай волі — мы павінны захаваць мір на планеце. Мір павінен быць у кожнай краіне. Толькі гэта з'яўляецца залогам будучага развіцця любой краіны і ў цэлым захавання жыцця на нашай планеце».

Прыняцце заявы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у сувязі з 80-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гадоў, па меркаванні **Старшыні Палаты прадстаўнікоў Ігара СЕРГЯЕНКІ**, з'яўляецца значным крокам, які дэманструе міралюбівую пазіцыю Беларусі, накіраванасць на захаванне гістарычнай праўды. Як канстатаваў спікер, наша краіна знаходзіцца напярэдадні знамянальнай падзеі — 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. «Няма больш трагічнага, але ў той жа час больш вялікага свята ў жыцці нашых краін, — падкрэсліў ён. — Гэта дата — напамін пра бессмяротны подзвіг нашых продкаў, пра кволасць міру, пра тую высокую цану, якую заплаціў савецкі народ за свабоду і незалежнасць, за магчымасць жыць пад мірным небам, гадаваць дзяцей».

Ігар Сергяенка звярнуў увагу на тое, што Палата прадстаўнікоў, дэпутацкі корпус актыўна ўдзельнічаюць у мерапрыемствах, прымеркаваных да гэтай свяшчэннай даты. «Усе прымаюць удзел у мерапрыемствах у рэгіёнах, запушчаны цыкл парламенцкіх чытанняў, — канкрэтызаваў ён. — Літаральна пазаўчора дэпутаты зрабілі свой унёсак у рэалізацыю праекта «Жывая памяць удзячных пакаленняў». Станоўчыя водгукі ідуць і пасля прэзентацыі кнігі «Невядомыя старонкі вайны адкрываюць дэпутаты беларускага Парламента». На наступным тыдні ў Валгаградзе пройдзе міжнародны патрыятычны форум Саюзнай дзяржавы «Вялікая спадчына — агульная будучыня».

**Вераніка КАНЮТА.**

# «НАПАМІН АБ НАШАЙ РАШУЧАСЦІ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Нягледзячы на адсутнасць суверэнітэту на той момант, за свой значны ўнёсак у Вялікую Перамогу Беларусь стала адной з дзяржаў — заснавальніц ААН і паставіла свой подпіс пад статутам арганізацыі. Мы тады здолелі разам выбудаваць архітэктуру міжнароднага права, дасягнуць агульнага разумення і адзінага тлумачэння асноўных глабальных выклікаў і пагроз. Усё гэта трымалася на кансэнсусе меркаванняў аб Другой сусветнай вайне — яе прычынах, наступствах і ролі кожнага ўдзельніка».

Міністр таксама заўважыў, што сёння з'явіліся некаторыя дзяржавы, якія не згодныя з вынікамі Другой сусветнай вайны: «Перш за ўсё гэта тыя, хто тады быў на баку гітлераўскай Германіі, уключаючы сам Берлін. Сёння яны спрабуюць перапісаць гісторыю, пераасэнсаваць міжнародныя працэсы, якія адбываліся напярэдадні вайны. Іх мэта відавочная — апраўдаць агрэсію, «абяліць» здраднікаў і памагатых, сцерці з памяці злачынствы супраць мірнага насельніцтва. Нашчадкі катаў становяцца «героямі», ім узводзяць помнікі, а вызваліцеляў забываюць. І гэта адбываецца не дзесьці далёка, а на тэрыторыях, якія прымыкаюць да Беларусі. Свет страціў тое агульнае адзінства, якое калісьці дазволіла разбурыць Берлінскую сцяну і адкрыла шлях да канструктыўнага супрацоўніцтва паміж Усходам і Захадам».

Некалькі дзесяцігоддзяў гэта супрацоўніцтва, па словах кіраўніка МЗС, абараняла нас ад новых кровапралітных канфліктаў. Але сёння адраджэнне неафашызму стала трэндам, асабліва ў Еўропе.



Максім Рыжанкоў падкрэсліў, што Беларусь была і застаецца міралюбнай дзяржавай: «Мы нікому не пагражалі. Уся наша палітыка, якая праводзіцца Прэзідэнтам Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам, грунтуецца на міры і стабільнасці. Наша мэта, па-першае, — дзейнічаць у інтарэсах сваёй дзяржавы і будаваць устойлівую будучыню. Па-другое, захоўваць гістарычную праўду. Гэта наш святы абавязак перад нашчадкамі. Ісціну нельга знішчыць ні агароджамі, ні санкцыямі, ні гандлёвымі войнамі. Па-трэцяе, утрымаць мір што б там ні было. Праз 80 гадоў пасля той вайны мы зноў стаім на краі абрыву. І, па-чацвёртае, нарошчваць калектыўныя намаганні на міжнароднай арэне па барацьбе з неанацызмам і па пакаранні нацысцкіх злачынцаў».

Падчас канферэнцыі ўдзельнікі абмеркавалі актуальныя праблемы і падыходы ў вывучэнні гісторыі Другой сусветнай вайны, а таксама шэраг іншых пытанняў. У ходзе мерапрыемства таксама ўзнімаліся такія важныя праблемы сучаснасці, як недапушчэнне спроб фальсіфікацыі гісторыі і захаванне гістарычнай праўды аб Вялікай Айчыннай вайне.

З дакладам на тэму «Уклад таджыкістанцаў у вызваленне Беларусі ад фашызму» выступіў **дырэктар Нацыянальнага музея Таджыкістана Зафаршо ІБРАХІМЗАДА**. У размове з журналістамі ён адзначыў, што тэма Вялікай Айчыннай вайны для таджыкістанцаў вельмі важная: «У гады Вялікай Айчыннай вайны насельніцтва нашай рэспублікі складала 1 мільён 250 тысяч чалавек, з якіх 300 тысяч чалавек удзельнічалі ў барацьбе з фашызмам. Вялікая Перамога над гітлераўцамі заўсёды была, ёсць і будзе для нашага народа свяшчэнным святам», — сказаў ён.

На думку **Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь Іліны ВУКАЙЛАВІЧ**, памятаць пра перамогу над гітлераўскім тэрорам варта не толькі ў дні гадавін, але і на працягу ўсяго жыцця: «Мы павінны пастаянна шанаваць памяць тых людзей, якія загінулі абараняючы сваю Радзіму. У Беларусі, як і ў Сербіі, 9 Мая прынята адзначаць урачыста. Сербы ўдзяляюць гэтаму вялікую ўвагу — у школьных праграмах, культуры. Мы публікуем шмат матэрыялаў на гэту тэму».

Пасол таксама адзначыла, што ў Беларусі вельмі многае робіцца для захавання гістарычнай памяці: «Мы лічым гэта вельмі важнай традыцыяй як для выхавання падрастаючага пакалення, так і для нас, людзей, якія часова пражываюць і працуюць у Беларусі. Сербія падзяляе з беларусамі гэту частку гісторыі, гэту барацьбу, гэтыя традыцыі. Нават калі казаць не толькі пра геаграфічныя граніцы, а ў больш шырокім, цывілізацыйным сэнсе — у нас шмат агульнага».

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!
Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК КП(б)Б БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

## ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ

### • У тыле

«За апошні час калектыў станцыі Мінск-таварная дабіўся значных поспехаў у сваёй рабоце, — пісала «Звязда». — Гэтых вынікаў тут дасягнулі дзякуючы сацыялістычнаму спаборніцтву, якое шырока разгарнулася сярод усіх змен».

Наперадзе ішла змена дыспетчара Іваніко. «У ноч з 17 на 18 красавіка саставіцель гэтай змены тав. Панкоў прыняў парк без свабодных пуцей, — паведамляла наша газета. — Да канца дзяжурства ён здаў 5 свабодных пуцей, апрацаваў 7 і прыняў 6 паяздоў. Выдатных поспехаў у рабоце дабіліся таксама дзяжурны па парку таварыш Еромін і саставіцелі — таварышы Грынчук і Пазднякоў».

**«21 красавіка змена таварыша Іваніко ўступіла на сталінскую вахту ў чэсць Першага мая. Адначасова рабочымі гэтай змены былі ўзяты абавязацельствы: знізіць мясцовы прастой, у выдатным становішчы ўтрымліваць стрэлкі і дабіцца стопрацэнтнага адпраўлення паяздоў па раскладу».**

Ва ўсіх зменах станцыі выпускаліся насценгазеты, баявыя лісткі. На асобныя недахопы ў рабоце хутка рэагавалі лісткі-маланкі. Падэкадна падводзіліся вынікі спаборніцтва.

«Агітатары змен праводзяць з рабочымі чыткі газет і гутаркі. Агітатары Шышко і Сабіла заўсёды падрыхтоўваюцца да гутарак і праводзяць іх змястоўна і цікава», — пісала «Звязда».




Такім чынам, добра наладжаная работа спрыяла далейшаму разгортванню сацыялістычнага спаборніцтва, умацаванню працоўнай дысцыпліны, паляпшэнню ўсёй работы калектыву.




### • На фронце

**Войскі 1-га Беларускага фронту, перайшоўшы ў наступленне з плацдармаў на заходнім беразе Одэра, пры падтрымцы масіраваных udараў артылерыі і авіяцыі, прарвалі вельмі ўмацаваную, глыбока эшаланіраваную абарону немцаў, якая прыкрывала Берлін з усходу, прасунуліся ўперад ад 60 да 100 кіламетраў і авалодалі гарадамі Франкфурт на Одэры, Вандлітц, Араніенбург, Біркенвердэр, Генігсдорф, Панкаў, Фрыдрыхсфельдэ, Карлсхорст, Кепенік і ўварваліся ў сталіцу Германіі — Берлін.** «У баях за 22 красавіка войскі фронту ўзялі ў палон звыш 4 000 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі 85 палявых гармат, 3 100 аўтамашын, 67 паравозаў, 1 800 чыгуначных вагонаў і 30 складаў з рознай ваеннай маёмасцю», — паведамляла Савецкае інфармбюро.

Войскі 1-га Украінскага фронту, перайшоўшы ў наступленне, прарвалі абарону немцаў на рацэ Нейсе, прасунуліся ўперад ад 80 да 160 кіламетраў, авалодалі гарадамі Котбус, Любен, Цосен, Беелітц, Лукенвальдэ, Троенбрытцэн, Цана, Марыенфельдэ, Трэбін, Рангсдорф, Дзідэрсдорф, Цэльтоў і ўварваліся з поўдня ў сталіцу Германіі — Берлін.

«Адначасова на Дрэздзенскім напрамку войскі фронту з баямі занялі гарады Эсен, Кірхайн, Фалькенберг, Мюльберг, Пульснітц і выйшлі на раку Эльба на паўночным захадзе ад Дрэздзена», — пісала «Звязда».

Войскі 4-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне, 22 красавіка на тэрыторыі Чэхаславакіі штурмам авалодалі горадам Опава (Троппау) — важным вузлом дарог і моцным апорным пунктам абароны немцаў.

«На тэрыторыі Чэхаславакіі, на паўднёвым захадзе ад Гадоніна, войскі 2-га Украінскага фронту з баямі занялі горад Мікулаў і населеныя пункты Ледніцэ, Пулгары, Паўлаў, Перна, Пратлсбрун, Дольныя, Дунаевіцэ, Добрае Поле», — паведамляла наша газета.

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**

МЫ — МАЛАДЫЯ

# КАЛІ КАХАЕШ, ШЛЮБ НЕ АДКЛАДАЕШ

## Да бацькоў — пасля першага спаткання. Чаму б і не?

Спрэчкі на тэму, у якім узросце лепш браць шлюб, напэўна, не ўціхнуць ніколі. Але гэта не так важна, калі сустракаюцца два кахаючыя сэрцы. Так здарылася ў Віялеты і Аляксандра.
Яны пазнаёміліся, калі дзяўчыне было 17, а хлопцу — 21.
З тых часоў не расставаліся, і ўжо два гады ў шлюбе.
Пагаварылі з маладой парай аб тым, як яны рашыліся на такі крок і як да гэтага паставіліся іх сем'і.

### ХАЦЕЛІ СУР'ЁЗНЫХ АДНОСІН

У гісторыі знаёмства пары няма нічога незвычайнага. Усё вельмі проста. Пазнаёміліся ў дэйтынгавым дадатку. Сучасны зручны спосаб, які аказваецца рабочым, калі ўмець весці дыялог і быць зацікаўленым у стасунках, адзначылі маладыя. І хлопец, і дзяўчына ішлі па пошук сур'ёзных адносін.

***— Нам абаім хацелася стварыць трывалыя адносіны, якія стануць апорай і перарастуць у моцную сямейную сувязь, — распавядае дзяўчына. — Я заўсёды выступала за традыцыйныя каштоўнасці. Кажу гэта не для галачкі, а таму, што ведаю, наколькі важна мець блізкага чалавека, які раздзеліць з табой не толькі радасць, але і праблемы.***

### ЯК У КІНО

Першым напісаў Аляксандр. Кажа, што ўбачыў фота і адразу нешта адчуў. Так звычайна ў кіно гавораць, і здаецца, што ў рэальным жыцці такое не здараецца. Але вось ён, вынік — той першы погляд на анкету перарос у вялікае каханне.

***— Праўда, усё было не так проста, бо Віялета далёка не адразу пагадзілася прыйсці на спатканне. Перапіска ішла недзе каля паўтара месяца, і я вельмі спадзяваўся, што мы сустрэнемся, хоць на момант знаёмства мы жылі за 180 кіламетраў адно ад аднаго. Я — у Гродне, а мая будучая жонка — у Карэліцкім раёне.***

Віялета збіралася прыехаць у Гродна па пропуск на ЦТ і ўсё ж адважылася на сустрэчу з Сашам. Дзяўчына кажа, што перапіска была цікавая. Зразумела, што на анкету Віялеты адгукаліся і іншыя хлопцы, пісалі, але адносіны неяк не складваліся. А вось з будучым мужам словы ішлі самі.

### НАШТО ЧАКАЦЬ?

Малады чалавек не марнаваў часу, пасля першага спаткання прапанаваў пазнаёміцца з бацькамі, а праз 10 месяцаў, калі Віялеце споўнілася 18, зрабіў ёй прапанову.

— Мы адзначалі дзень нараджэння ўдваіх. Купіў прыгожы букет, стаў на адно калена і папрасіў быць маёй жонкай. А навошта чакаць? Я ж у самым пачатку зразумеў, што яна — мой чалавек.

Віялета расказвае, што пасталела зусім у юным узросце. Дзяўчына рана засталася без бацькі, ва ўсім дапамагала маме і бабулі.

***— Так, шлюб ранні, але калі мае мама і бабуля пазнаёміліся з Сашам, то адразу зразумелі, што ён добры хлопец і яму можна давяраць. Яны сказалі: «Калі нешта не атрымаецца, гэта стане ўрокам. Калі ўсё добра будзе, шчасліва пражывеш жыццё з каханым чалавекам».***

Бацькі Аляксандра таксама не былі супраць шлюбу. Яны бачылі, што іх сын гатовы да гэтага, кахае Віялету, ды і дзяўчына ім спадабалася.

### ПАВАГА І КАХАННЕ

Муж і жонка адзначаюць, што галоўны сакрэт паспяховага сямейнага жыцця — павага і каханне. Адно без другога не можа быць. Усе пытанні і праблемы абмяркоўваюць адразу, не назапашваюць крыўды, не бачаць сэнсу пашыраць канфліктную сітуацыю, калі такая ўзнікае.

***— Калі я ў нечым вінаваты, ніколі не буду гэтага адмаўляць. Проста папрашу прабачэння,*** — падкрэслівае Аляксандр.

***— Я тое ж самае раблю. Мы ўсе людзі, у кожнага свой характар, розныя сітуацыі бываюць.***

### ДОМ — МЕСЦА АДПАЧЫНКУ

Віялета яшчэ вучыцца ў ГрДУ імя Янкі Купалы на філалагічным факультэце. Цяпер дзяўчына на 3 курсе, яшчэ і працуе ў школе настаўніцай. На маё пытанне, як у яе атрымліваецца сумяшчаць сям'ю, працу і вучобу, з усмешкай адказвае:

***— Мне падабаецца атрымліваць новыя веды ва ўніверсітэце, удасканальвацца як прафесіянал. Я люблю працу ў школе, узаемадзейнічаць з дзецьмі. Мяне падтрымлівае муж, так што дома я адпачываю. Вядома, мы займаемся бытам, але ўсё роўна гэта больш для душы.***



**Маладыя людзі адзначаюць, што дом — гэта іх бяспечнае месца, дзе яны могуць адпачыць, аднавіцца, прывесці думкі ў парадак. Хатнія абавязкі дзеляць разам.**

***— Думаю, гэта ўсё з дзяцінства ідзе. У мяне тата заўсёды маме дапамагае,*** — расказвае Аляксандр. ***— Мне няцяжка нешта прыгатаваць ці прыбраць. Гэта ж наш агульны дом, а значыць, і абавязкі агульныя.***

### НАПЕРАДЗЕ ТАК ШМАТ ДЗІВОСНАГА

Адпачынак муж і жонка любяць актыўны. Яшчэ ў самым пачатку адносін яны падарожнічалі па Беларусі. Садзіліся ў машыну і адпраўляліся ў дарогу, аб'ездзілі амаль усю Гродзенскую вобласць. У планах — уся Беларусь. У цёплую пару года едуць на рыбалку, у паходы з начлегам ці проста на прыроду.

Дарэчы, сужэнцы будуць удзельнічаць у Рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх сем'яў «Шчаслівыя разам». Раней удзельнікамі маглі стаць толькі пары, дзе муж і жонка — студэнты. Калі Віялета даведалася, што цяпер гэта можа быць нехта адзін, прапанавала Сашу паўдзельнічаць, і ён пагадзіўся.

***— Трэба падтрымліваць жонку,*** — усміхаецца Аляксандр. ***— Тым больш што мне спадабалася праграма. Зможам пазнаёміцца з іншымі парамі, расказаць пра сябе. Думаю, будзе здорава.***

**Маладыя людзі адзначаюць, што наперадзе ў іх так шмат дзівоснага. Адзін з найважнейшых крокаў — дзеці. Абое хочуць папаўнення ў сям'і, але пакуль вырашылі дачакацца заканчэння вучобы Віялеты. Адзначаюць, што Беларусь — выдатная краіна для нараджэння і выхавання дзяцей, і абавязкова іх сям'я стане большай.**

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**

НАШЫ КАШТОЎНАСЦІ

# НІБЫ НАРЭШЦЕ САБРАЛІСЯ РАЗАМ

## Пра работу, дом і траіх дзяцей разважаюць шматдзетныя бацькі Шавялёвы



Сям'я Шавялёвых з вёскі Паляцічы Кобрынскага раёна можа быць прыкладам для многіх. Ірына і Сяргей пажаніліся падчас вучобы ва ўніверсітэце. А да 30 гадоў яны ўжо былі шматдзетнымі бацькамі. Цяпер муж і жонка працуюць на адным прадпрыемстве, жывуць у сваім доме, кожны водпуск прысвячаюць падарожжам і знаёмствам з новымі мясцінамі.

Зрэшты, пра ўсё па парадку. Ірына гаворыць, што ніколі не разглядала перспектыву быць хатняй гаспадыняй, хоць пры наяўнасці траіх дзяцей, дома, участка з агародам і садам работы хапіла б. Распарадак дня ў іх напружаны, але ўсё прадумана. У Сяргея работа пачынаецца ў 6.30, у Ірыны — у 8.00, але ж трэба прыгатаваць сняданак, сабраць і выправіць старэйшых у школу, адвезці малую ў садок і паспець на працу. Устаюць сужэнцы вельмі рана. «У нас дзве машыны, я таксама вадзіцель са стажам. А да работы з вёскі ехаць чвэрць гадзіны, таму не праблема», — гаворыць маці сямейства.

Далей Ірына расказвае, што выраслі яны з мужам амаль у суседніх вёсках, а пазнаёміліся падчас вучобы. Вучыліся ў Брэсцкім тэхнічным універсітэце на адным факультэце, па адной спецыяльнасці, ён — на трэцім курсе, яна — на першым. Праз два гады, калі Сяргей заканчваў вучобу, згулялі вяселле. Яна працягвала вучыцца на дзённым аддзяленні. Незадоўга да выпуску нарадзілася дачушка Варвара. Маладая маці здавала апошнюю сесію, рыхтавалася да абароны дыплома, з малой дапамагалі маці і бабуля. А ў дзень абароны даведалася, што чакае другое дзіця. І ўжо калі ў сям'і было двое, яны прынялі рашэнне будаваць дом.

Абое па спецыяльнасці інжынеры-меліяратары, атрымалі размеркаванне на Кобрынскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм. Спачатку жылі ў Батчах у бацькоў Ірыны. Яны прапаноўвалі будаваць кватэру ў Кобрыне, абяцалі дапамогу, але маладыя муж і жонка вырашылі ўзводзіць свой дом — абое ж выраслі ў вясковых хатах, на прыродзе, на чыстым паветры. Таму ўзялі ўчастак у Паляцічах і ўвязаліся ў будоўлю. Ірына ўжо выйшла з дэкрэтнага, працавала на адным прадпрыемстве з мужам, ён — прарабам, яна — інжынерам у планавым аддзеле. І недзе бліжэй да завяршэння будаўніцтва дома даведаліся, што зноў чакаюць дзіця. Меншую дачушку з матуляй шчаслівы тата забіраў з радзільнага дома ўжо ў свой дом.

Цікава разважае бацька гэтага сямейства: «Не раз даводзілася чуць, што паўнавартасная сям'я можа быць толькі з трыма дзецьмі. А чаму так і ці так гэта, хто ведаў? Цяпер становіцца зразумела. З трэцім дзіцем прыходзіць новы ўзровень усведамлення мацярынства і бацькоўства. Ва ўсякім разе, у нас выйшла менавіта так. Мы адчуваем сябе сям'ёй у поўным складзе, нібы нарэшце сабраліся разам і зажылі».

— Усё паспяваем. Мы не лянівыя, абое працавітыя, — працягвае жонка. — Муж заўсёды бярэцца за любую падпрацоўку, каб зарабіць капейку для сям'і. Свой агарод таксама дае пэўную эканомію. Летам актыўна робім нарыхтоўкі. Свае бульба, цыбуля, морква. Вара ўжо дапамагае палоць грады. Я лічу, што дзеці з малых гадоў павінны прывучацца да пасільнай працы. Матфей не адыходзіць ад бацькі, калі той завіхаецца каля машыны. Думаю, што асабісты прыклад — найлепшае выхаванне.

— Аднойчы на сваім маленькім сямейным савеце мы прыйшлі да высновы: трэба не толькі імкнуцца паляпшаць дабрабыт, будаваць, здабываць, але і назапашваць эмоцыі, успаміны, — расказваюць сужэнцы. — Трэба больш падарожнічаць, адкрываць новае. Так і робім ужо некалькі гадоў. Адкрываем і сваю краіну, і іншыя. Раней падарожнічалі з двума дзецьмі, а цяпер з трыма. Адзін год, напрыклад, лялалі ў Грузію ўсе разам. Міры было толькі паўтара года, непакоіліся, як яна перанясе пералёт. А яна ў самалёце спала ўвесь час і нічога не заўважыла.

Два гады таму адправіліся на адпачынак у далёкае падарожжа, былі аж у Краснадарскім краі. Ездзілі машынай. У адзін бок адлегласць склала дзве з паловай тысячы кіламетраў. Адны наўрад ці адважыліся б на такі пераезд, а так сабраліся чатыры сям'і аднадумцаў-знаёмых, ну і выправіліся ў дарогу. Калі прыехалі і падбілі баланс, то высветлілася, што адпачынак абышоўся ў два з паловай раза танней, чым годам раней з авіяпералётам. Гэта важна, бо пасля адпачынку адразу на парадак дня паўстаюць клопаты аб падрыхтоўцы старэйшых да школы, малой — да садка. А пасля водпуску, як і ў кожнай сям'і, даводзіцца ўключаць рэжым эканоміі.

— І тады вельмі дарэчы выглядае дапамога дзяржавы, — працягвае маці сямейства. — Штогод як шматдзетная сям'я атрымліваем і дзяржаўную, і ад прадпрыемства. Паводле калектыўнага дагавора, «Кобрынскае ПМС» выдзяляе пэўную суму грошай ад прадпрыемства і ад прафсаюзнай арганізацыі на кожнае дзіця. Прычым атрымлівае кожны з нас як член працоўнага калектыву. І гэта вельмі істотны ўнёсак у падрыхтоўку нашых школьнікаў, бо самі ведаеце, сёння дзіцячыя рэчы каштуюць амаль як дарослыя. За дапамогу наша сям'я ўдзячная і дзяржаве, і прадпрыемству. Так што для бацькоў, якія ў роздуме аб колькасці дзяцей, наш прыклад, думаю, можа быць стымулам, — заключыла Ірына Шавялёва.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з архіва герояў.**



## ДЗЯРЖАЎНЫЯ ДАПАМОГІ ПА ДОГЛЯДЗЕ ДЗІЦЯЦІ

**Дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці (аднаразовая)**

100 % БПМ, або 447,64 рубля

**Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці (аднаразовая)**

✓ пры нараджэнні першага дзіцяці

10 БПМ, або 4 476,40 рубля

✓ пры нараджэнні другога і наступных дзяцей

14 БПМ, або 6 266,96 рубля

**Дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў (штомесячная)**

50 % БПМ, або 223,82 рубля

**Дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў (штомесячная)**

✓ на дзяцей, старэйшых за 3 гады, якія выхоўваюцца ў такіх сем'ях (акрамя дзіцяці-інваліда)

50 % БПМ, або 223,82 рубля

✓ на дзіця-інваліда, старэйшага за 3 гады

70 % БПМ, або 313,35 рубля

**Дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў (штомесячная)**

✓ з І і ІІ ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці 18 гадоў і з ІІІ і IV ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці ўзросту 3 гадоў

100 % БПМ, або 447,64 рубля

✓ з ІІІ і IV ступенню страты здароўя пасля спаўнення дзіцяці ўзросту 3 гадоў

120 % БПМ, або 537,17 рубля

Пры выхаванні ў сям'і дваіх і больш дзяцей, адно з якіх ва ўзросце да 3 гадоў, выплачваюцца дзве дапамогі: на дзіця да 3 гадоў (40 % СЗП) і дзіця (дзяцей) ад 3 да 18 гадоў (50 % БПМ). Сумарны памер — 1208,3 рубля.

**У 2025 годзе на выплату дапамог па мацярынстве і сямейных дапамог плануецца накіраваць 3,7 мільярда рублёў, з іх амаль 2 мільярды — на выплату дапамог па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| ЛОТ № 1 | Капитальное строение с инв. № 500/С-25974, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кульман, 16/ 1. Площадь – 1350 кв. м, наименование – Здание кафе (лит. В 2/к), назначение – Здание специализированное для общественного питания, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000008006969, площадью 0,1982 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве аренды (срок действия: по 30.06.2028). Объект недвижимости обременен правом аренды. На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): охранные зоны линий электропередач, площадь 0,0107 га, охранные зоны сетей и сооружений канализации, площадь 0,0245 га | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **3 400 322** | **Задаток, BYN** | **340 032,20** | **Шаг аукциона** | 5 % |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ» Республика Беларусь, 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62 Тел. +375 (17) 388 90 99. E-mail: mpovt@mpovt.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр. Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8044 580 63 02 (Александра) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр. Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 5 мая 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **6 мая 2025 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Филиал УПП «Нива»-«Завод горно-шахтного оборудования», 223710, Минская обл., Солигорский район, Чижевичский с/с, 5/3-1, Метявичское шоссе |

**Предмет электронных торгов: оборудование (бывшее в употреблении), расположенное в г. Солигорск (территория завода)**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 6519 | Пресс-ножницы комбинированные гидравлические НКМ-65 (сер. 2011-153158), 2011 г. в. | **2880,00** |
| 2 | 4676 | Станок консольно-фрезерный ГФ2171С5 б/у | **11520,00** |
| 3 | 0004180 | Станок координатно-расточной 2431С, 1990 г. в. | **9600,00** |
| 4 | 5623 | Станок токарно-карусельный СК-17 | **126000,00** |
| 5 | 6614 | Вращатель сварочный универсальный М-11070А, 2012 г. в. | **4800,00** |
| 6 | 6486 | Вращатель сварочный Rotamatic ST 15WW000272477 | **1800,00** |
| 7 | 5113 | Станок фрезерный для обработки торцов SBM-500, 2017 г. в. | **26004,00** |
| 8 | 4294 | Станок вертикально-сверлильный мод. 2Н150 | **3000,00** |
| 9 | 4871 | Аппарат контактной сварки | **10560,00** |
| 10 | 7015 | Станок токарно-винторезный 1М-63 БФ101 с РМЦ 2800 мм, 1989 г. в. | **18000,00** |
| 11 | 4272 | Станок токарно-винторезный 1М63, 1997 г. в. | **18000,00** |
| 12 | 6414 | Парогенератор ПАР-50Н-1, 2023 г. в. | **10380,00** |
| 13 | 5451 | Станок плоскошлифовальный 3Л722В с малой наработкой в к-те с плитой электромагнитной (320x1250) | **48889,20** |
| 14 | 423000 | Патрон токарный | **3232,80** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется участником электронных торгов в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от **6 %** до **10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 26.05.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **23.05.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Несвижский райагросервис»** (Продавец)

Аукцион состоится **15.05.2025 в 14.00**
по адресу: **г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

**Лот № 1 в составе:**

1. **Гараж для автомашин** с инв. № 621/С-1029368, 1359,1 кв. м. Земельный участок 624283500001000082 (0,819 га). Право аренды.
2. **Гараж для автомашин** с инв. № 621/С-1029367, 827,4 кв. м. Земельный участок 624283500001000081 (0,1393 га). Право аренды.
3. **Мехмастерские** с инв. № 621/С-1029370, 1090,3 кв. м. Земельный участок 624283500001000084 (0,97 га). Право аренды.
4. **Электроцех мехмастерских** с инв. № 621/С-1029371, 273,5 кв. м. Земельный участок 624283500001000083 (0,26 га). Право аренды.

Адрес: Минская область, Несвижский район, Несвижский с/с, 20/3, 20, 20/2, 20/1 вблизи г. Несвиж.
Начальная цена с НДС 20 % – 932 050,80 руб.
Задаток – 93 205,08 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – 13.05.2025 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Альфа-Банк

## Закрытое акционерное общество «Альфа-Банк»

220013, Минск, ул. Сурганова, 43-47,
тел.: (017) 217-64-63, 217-64-59, факс (017) 200-59-29
Телекс 252190 ITIB BY, SWIFT ALFA BY 2X

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 31 ДЕКАБРЯ 2024 ГОДА ЗАО «АЛЬФА-БАНК»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2024 год | 2023 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 4 | 742 505 | 1 071 649 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 5 | 1 143 202 | 982 492 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 6 | 679 186 | 314 123 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 7 | 536 126 | 447 337 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 8 | 4 655 519 | 3 435 741 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 9 | 1 529 | 83 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 0 | 0 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 10 | 174 715 | 145 789 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 11 | 316 | 2 733 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 12 | 300 | 241 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 13 | 142 569 | 91 888 |
| 15 | ИТОГО АКТИВЫ | 11 | | 8 075 967 | 6 492 076 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 0 | 0 |
| 18 | Средства банков | 1202 | 15 | 90 744 | 407 464 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 16 | 6 318 688 | 4 645 917 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 17 | 164 679 | 234 838 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 18 | 177 | 323 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 19 | 179 638 | 136 939 |
| 24 | Всего обязательства | 120 | | 6 753 926 | 5 425 481 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 20 | 101 372 | 101 372 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 21 | 170 000 | 150 000 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 22 | 61 430 | 56 938 |
| 30 | Накопленняа прибыль | 1215 | 23 | 989 239 | 758 285 |
| 31 | Всего собственный капитал | 121 | | 1 322 041 | 1 066 595 |
| 32 | ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | 12 | | 8 075 967 | 6 492 076 |

Председатель Правления
В.С. Смоляк

14 марта 2025 г.
Минск

Главный бухгалтер
А.В. Скрипка

14 марта 2025 г.
Минск

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2024 ГОД ЗАО «АЛЬФА-БАНК»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2024 год | 2023 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 24 | 568 320 | 412 367 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 24 | 169 516 | 90 757 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 24 | 398 804 | 321 610 |
| 4 | Комиссиионные доходы | 2021 | 25 | 385 593 | 253 751 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 25 | 80 058 | 47 516 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 25 | 305 535 | 206 235 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 26 | 3 533 | 13 830 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 27 | 151 697 | 121 499 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 28 | 13 634 | (1 383) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 29 | 120 142 | 115 697 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 30 | 26 788 | 29 553 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 31 | 414 158 | 325 944 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 32 | 38 103 | 28 777 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 327 588 | 220 926 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 77 501 | 48 356 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 250 087 | 172 570 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях: | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | 0,1234 | 0,0865 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | 0,1234 | 0,0865 |

Председатель Правления
В.С. Смоляк

14 марта 2025 г.
Минск

Главный бухгалтер
А.В. Скрипка

14 марта 2025 г.
Минск

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА ЗА 2024 год ЗАО «АЛЬФА-БАНК»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей собственного капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 31 декабря 2022 г. | 3011 | 70 422 | | 129 103 | 601 537 | 52 273 | 853 335 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 1.1 | результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | 30 950 | | 20 897 | 156 748 | 4 665 | 213 260 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 2.1 | совокупный доход | 30121 | x | x | x | 172 570 | 5 334 | 177 904 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 20 897 | (20 897) | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 30 950 | - | - | - | x | - |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями собственной эмиссии | 301233 | 30 950 | x | x | x | x | 30 950 |
| 2.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - |
| 2.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 669 | (669) | - |
| 2.9 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | 4 406 | - | 4 406 |
| 3 | Остаток на 31 декабря 2023 г. | 3013 | 101 372 | - | 150 000 | 758 285 | 56 938 | 1 066 595 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 31 декабря 2023 года | 3011 | 101 372 | - | 150 000 | 758 285 | 56 938 | 1 066 595 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | 0 | - | 20 000 | 230 954 | 4 492 | 255 446 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 5.1 | совокупный доход | 30121 | x | x | x | 250 087 | 5 360 | 255 447 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 20 000 | (20 000) | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 0 | - | - | - | x | 0 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с выкупленными акциями собственной эмиссии | 301233 | - | x | x | x | x | 0 |
| 5.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - |
| 5.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 868 | (868) | - |
| 5.9 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (1) | - | (1) |
| 6 | Остаток на 31 декабря 2024 г. | 3013 | 101 372 | - | 170 000 | 989 239 | 61 430 | 1 322 041 |

Председатель Правления
В.С. Смоляк

14 марта 2025 г.
Минск

Главный бухгалтер
А.В. Скрипка

14 марта 2025 г.
Минск

### СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА 2024 ГОД ЗАО «АЛЬФА-БАНК»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2024 год | 2023 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | | 250 087 | 172 570 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | 5 360 | 5 334 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств и прочего имущества | 3012121 | | 5 651 | 5 258 |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | | |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг, учитываемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | 3012123 | | (291) | 76 |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | | |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | | |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | | 255 447 | 177 904 |

Председатель Правления
В.С. Смоляк

14 марта 2025 г.
Минск

Главный бухгалтер
А.В. Скрипка

14 марта 2025 г.
Минск

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2024 ГОДА ЗАО «АЛЬФА-БАНК»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2024 год | 2023 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 548 725 | 404 768 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (167 137) | (88 901) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 384 608 | 252 659 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (79 514) | (47 753) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | (456) | 243 |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 156 056 | 109 599 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | 13 634 | (1 383) |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 41 667 | 50 380 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (430 678) | (335 382) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (78 806) | (47 589) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | 701 | | 388 099 | 296 641 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (21 957) | (14 736) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (298 243) | 39 387 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме приобретенных ценных бумаг, учитываемых по амортизированной стоимости) | 70202 | | (352) | 2 304 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (1 174 096) | (840 500) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | (1 446) | 1 594 |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (61 153) | (12 443) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого | 702 | | (1 557 247) | (824 394) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | - | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | (323 367) | 268 428 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 1 484 180 | 1 017 668 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг банка | 70303 | | (72 529) | 83 068 |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | (146) | (280) |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 26 323 | 2 026 |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого | 703 | | 1 114 461 | 1 370 910 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | (54 687) | 843 157 |
| 29 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (43 102) | (44 688) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 417 | 225 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | 0 | 0 |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, учитываемых по амортизированной стоимости | 71104 | | (159 005) | (178 353) |
| 35 | Погашение (реализация) приобретенных ценных бумаг, учитываемых по амортизированной стоимости | 71105 | | 88 707 | 125 245 |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (112 983) | (97 571) |
| 37 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | - |
| 39 | Выкуп акций собственной эмиссии | 72101 | | - | 0 |
| 40 | Продажа ранее выкупленных акций собственной эмиссии | 72102 | | 0 | 30 950 |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | - |
| 42 | Внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 72104 | | - | - |
| 43 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | 0 | 30 950 |
| 44 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 41 937 | 163 274 |
| 45 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | (125 733) | 939 810 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | x | 2 293 862 |
| 47 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | | 2 168 129 | x |

Председатель Правления
В.С. Смоляк

14 марта 2025 г.
Минск

Главный бухгалтер
А.В. Скрипка

14 марта 2025 г.
Минск

iqt integrity quality trust

# Аудиторское заключение

Смоляку Валерию Степановичу,
Председателю Правления Закрытого акционерного общества «Альфа-Банк»

### Заключение по годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности

#### Аудиторское мнение

